

Варты досвед

XIX Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі краін СНД зладзілі 9–10 чэрвеня ў Бішкеку. Мерапрыемства сабрала каля 200 удзельнікаў.

Цэнтральнымі тэмамі сталі надыходны векавы юбілей з дня нараджэння выбітнага пісьменніка Чынгіза Айтматава і 35-годдзе Садружнасці. Так, на дыскусійных пляцоўках абмяркоўвалася супрацоўніцтва краін СНД у навуцы і адукацыі, уплыў творчасці Чынгіза Тарэкулавіча на сучасны літаратурны працэс і лічбавыя тэхналогіі ў культурнай прасторы.

Сярод выступоўцаў былі і члены беларускай дэлегацыі: генеральны дырэктар Вялікага тэатра Кацярына Дулава, прарэктар па навуковай рабоце Акадэміі музыкі Нэлі Мацаберыдзэ, загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры БДУКМ Таццяна Жылінская, вучоны сакратар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Наталля Калядчык.

Кульмінацыяй форуму паслужыла цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Міждзяржаўнай прэміі СНД "Зоркі Садружнасці". Яна ўручаецца за выдатныя дасягненні ў сферы мастацтва, навукі і адукацыі. Ушанавалі і нашага суайчынніка — Аляксандра Міхалевіча, акадэміка, навуковага кіраўніка Інстытута энергетыкі Нацыянальнай акадэміі навук.

Акрамя таго, сталі вядомыя вынікі маладзёжнай прэміі "Садружнасць дэбютаў". У ліку лаўрэатаў — Іосіф Нікіценка, саліст Вялікага тэатра Беларусі, студэнт Акадэміі музыкі.

Па традыцыі была прэзентавана культурная сталіца СНД. У 2027 годзе эстафету ў армянскага горада Мегры прыме Маладзечна.

Арганізатары форуму — Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва краін Садружнасці і Міністэрства культуры, інфармацыі і маладзёжнай палітыкі Кыргызстана.